ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1982
21
КАСТРЫЧНІКА
ЧАЦВЕР
№ 29 (1367)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

## Няхай жыве 60-годдзе ўтварэння Саюза ССР — свята інтэрнацыянальнага адзінства, дружбы і брацтва ўсіх савецкіх народаў!

## Грамадзяне Савецкага Саюза! Сустрэнем слаўны юбілей новымі поспехамі ў працы, вучобе, творчасці!

(З Заклікаў ЦК КПСС).

"Беларускі універсітэт"

тэлетайп

• Учора • Сёння • Заўтра •

### НА ПАСЯДЖЭННІ ПРЭЗІДЫУМА ПРАФКОМА

разгледжана пытанне аб рабоце спартыўна-аздараўленчай камісіі за справаздачны перыяд, заслухана інфармацыя аб падрыхтоўцы да справаздачна - выбарных канферэнцый, а таксама намечаны мерапрыемствы да сяткавання 65-й гадавіны Вялікага Кастрычніка.

**Н. ТУРОМША,**
**намеснік старшыні прафкома.**

### СУСТРЭЧА

з заслужанай артысткай РСФСР, лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі ГДР Ларысай Лужынай адбылася на днях у БДУ імя У. І. Леніна. Артыстка адказала на шматлікія пытанні студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэта, расказала аб сваім творчым шляху, падзялілася думкамі аб ідэйна-тэматычным змесце савецкіх і замежных фільмаў, аб развіцці кінематаграфіі ў СССР.

**З. АЛЯКСАНДРАВА.**

### ПАРТЫЙНЫ СХОД

пройдзе на механіка-матэматычным факультэце. Ён абмяркуе задачы партыйнай арганізацыі факультэта па ўдасканаленню працоўнага і маральна-эстэтычнага выхавання студэнтаў.

**У. АБРАМОВІЧ,**
**студэнт журфака.**

### ДЗЕНЬ ЗАВОЧНІКА

прайшоў ва універсітэце. У гэты дзень студэнтам-завочнікам даецца магчымасць атрымаць кваліфікаваныя кансультацыі выкладчыкаў, высветліць незразумелыя пытанні, якія ўзніклі ў ходзе выканання кантрольных работ, абараніць справаздачы аб вытворчай практыцы. Найбольш працавітыя змогуць датэрмінова здаць экзамены.

**І. БАРДЗІЯН,**
**студэнтка журфака.**

● АДЗІНЫ ПАЛІТДЗЕНЬ

## У ЕДНАСЦІ БРАТНЯЙ



ІДЭАЛАГІЧНАЯ работа знаходзіцца ў цэнтры ўвагі партыйнай арганізацыі універсітэта. Асаблівае значэнне набывае ідэйна-палітычнае выхаванне ў наш час, калі перад савецкім чалавекам стаяць грандыёзныя задачы камуністычнага будаўніцтва, калі ад свядомага разумення кожным свайго месца і ролі ў эканамічным, палітычным і грамадскім жыцці залежыць, у канчатковым выніку, дабрабыт і шчасце ўсіх.

Нядаўна на хімічным факультэце ў рамках адзінага палітдня з лекцыяй «Беларусь у братняй сям'і народаў СССР» выступіў заслужаны дзеяч культуры БССР, дацэнт Уладзімір Анатольевіч Навіцкі.

— Небывалых раней вяршынь дасягнула Беларусь за гады Савецкай улады, — сказаў У. А. Навіцкі. — Некалі адсталая ўскраіна царскай імперыіператварылася ў квітнеючы край, стала рэспублікай высокаразвітай індустрыі, сельскай гаспадаркі, рэспублікай вучоных, артыстаў і паэтаў.

Аднак нельга забываць, — працягваў У. А. Навіцкі, — што кожны наш крок наперад — гэта вынік настойлівых намаганняў усіх рэспублік краіны Саветаў, самаадданай працы кожнага савецкага чалавека. Беларусь адчувае сяброўскую падтрымку народаў СССР, дружба і братэрства з'яўляюцца гарантыяй нашых перамог.

**БЛІЦ-ІНТЭРВ'Ю ПАСЛЯ ЛЕКЦЫІ**

**Дацэнт хімфака Т. П. Каратаева:**

— Роўная сярод роўных — так можна назваць нашу рэспубліку. Цікава было даведацца аб эканамічным і культурным развіцці Беларусі, аб яе месцы ў братняй сям'і народаў СССР, усвядоміць сваю адказнасць перад днём сённяшнім...

**Інжынер НДІ ФХП Т. М. Урублеўская:**

— Харчовая праграма — справа ўсенародная. Павышэнне ўрадлівасці глебы, атрыманне высокіх ураджаяў залежыць і ад нас, вучоных-хімікаў. Асаблівую цікавасць выклікаў у мяне расказ аб матэрыялах майскага (1982 г.) Пленума ЦК КПСС.

**А. ЛАЗОЎСКІ,**
**наш кар.**



**НА ЗДЫМКАХ: адзіны палітдзень на хімфаку; выступае У. А. НАВІЦКІ.**

Фота **В. Шачака.**

## ВІНШУЕМ ЛАЎРЭАТАЎ!

**Разгледзеўшы прапановы Камісіі ЦК ЛКСМБ па прэміях Ленінскага камсамола Беларусі ў галіне навукі і тэхнікі, бюро ЦК ЛКСМ Беларусі пастанавіла прысудзіць прэмію Ленінскага камсамола Беларусі ў галіне навукі і тэхнікі і прысвоіць ганаровае званне «Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі» аўтарам работ:**

**ЛІНЁВУ Уладзіміру Мікалаевічу** — асістэнту кафедры ядзернай фізікі і мірнага выкарыстання атамнай энергіі Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна, **ЛІСОЎСКАМУ Уладзіміру Вячаслававічу** — малодшаму навуковаму супрацоўніку кафедры ядзернай фізікі і мірнага выкарыстання атамнай энергіі Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна, **МАЧАЛЬСКАМУ Віктару Барысавічу** — малодшаму навуковаму супрацоўніку кафедры ядзернай фізікі і мірнага выкарыстання атамнай энергіі Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна, **МУРАЎСКАМУ Уладзіміру Аляксандравічу** — асістэнту кафедры ядзернай фізікі і мірнага выкарыстання атамнай энергіі Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна — за работу «Распрацоўка прынцыпаў пабудовы, стварэнне і ўкараненне ў народную гаспадарку новага класа радыёспектраметрычнай апаратуры».

**САЛЬКОВУ Анатолю Пятровічу** — в. а. дацэнта кафедры гісторыі СССР эпохі сацыялізму Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна, кандыдату гістарычных навук — за цыкл артыкулаў «Сацыяльная структура рабочага класа Беларускай ССР у перыяд развітога сацыялізму (па матэрыялах машынабудаўнічай і металаапрацоўчай прамысловасці 1959—1970 г. г.)».

Работа маладых супрацоўнікаў кафедры ядзернай фізікі з'яўляецца састаўной часткай маштабных даследаванняў, якія праводзяцца ва універсітэце, па распрацоўцы новых і ўдасканаленню існуючых прынцыпаў пабудовы радыёспектрычнай апаратуры і стварэнне на іх аснове новага класа радыёспектрометраў электроннага парамагнітнага рэзанансу. Аўтарамі вырашан шэраг навуковых і складаных інжынерна-тэхнічных праблем, што дазволіла палепшыць метралагічныя і эксплуатацыйныя параметры гэтага класа прылад.

Цыкл работ А. П. Салькова прысвечаны актуальнай тэме, якая мае непасрэдную сувязь з тэорыяй і практыкай камуністычнага будаўніцтва — развіццю і ўдасканаленню сацыяльнай структуры рабочага класа Беларускай ССР у перыяд развітога сацыялізму. Навуковая і практычная каштоўнасць распрацоўкі данай тэмы абумоўлена неабходнасцю выкрыцця лжэнавуковых тэорый буржуазнай гістарыяграфіі, якая вылучыла цэлы шэраг канцэпцый, што скажаюць ролю і месца рабочага класа ў нашай краіне, шляхі сацыяльнага развіцця грамадства, ход навукова-тэхнічнай рэвалюцыі. Аўтарам на аснове вялікага фактычнага матэрыялу машынабудаўнічай і металаапрацоўчай прамысловасці БССР даследаваны напрамкі ўдасканалення сацыяльнай структуры рабочага класа.

Прысуджэнне прэміі камсамола маладому чалавеку, які звязаў сваё жыццё з навукай, — своеасаблівае прызнанне яго першых поспехаў. Не выпадкова гэту прэмію называюць «прэміяй надзей». Яе прысуджэнне служыць крытэрыем сталасці, гатоўнасці і ўмення развіваць і прымнажаць лепшыя традыцыі айчыннай навукі.

Сардэчна віншуем лаўрэатаў прэміі Ленінскага камсамола Беларусі і жадаем новых творчых поспехаў.

# АЗБУКА ПЕРШАКУРСНІКА

ЛІЧЫЦЦА, што навыкі самастойнай працы цалкам прывіваюцца іменна ў ВНУ. Але ўсё часцей і часцей скардзяцца дэканы: няма адбою ад бацькоў непаспяваючых студэнтаў, не прывыкаюць рабяты да адказнасці за ўласныя ўчынкі. Інфантыльнасць — слова гэтае робіцца ўсё больш папулярным сярод педагогаў. Справа даходзіць да кур'ёзаў: вышэйшая навучальная ўстанова арганізуе... бацькоўскія сходы, піша лісты тым жа бацькам.

Дык што, здрабнеў студэнт? Звузілася яго поле дзейнасці? Няма дзе рэалізаваць прагу самастойнасці, выкарыстаць рэальна набытую незалежнасць?

Вучоба, адпачынак, быт — вось тры студэнцкія вымярэнні, і хай не здасца першакурсніку сумнай сённяшняя размова пра іх. Хутка ён зразумее: для таго, каб праявіць сваё «я» няма патрэбы чакаць нечага незвычайнага, дастаткова ўважліва агледзецца навокал.

Дык вось, яшчэ раз пра студэнцкую самастойнасць, пра самакіраванне студэнтаў. Словы гэтыя таксама гучаць у аўдыторыях і дэканатах, за іх галасуюць дзвюма рукамі і выкладчыкі, і студэнты.

**СТАРШАКУРСНІКІ РАЯЦЬ**

**— У першыя месяцы жыцця ў інтэрнаце ідзе непазбежная прыцірка характараў. Здараюцца і сваркі, старайцеся, каб яны не былі зацяжнымі. Вучыцеся ўступаць.**

**— Прыглядайцеся, як «старычкі» вядуць гаспадарку, распараджаюцца грашыма. Пустая кішэнь праз два дні пасля стыпендыі — з'ява не вельмі радасная.**

**— А галоўнае, каб у інтэрнаце быў поўны парадак. Выбірайце ў студсавет ініцыятыўных рабят, тады і справы на лад пойдуць, і камендант часцей усміхацца будзе.**

**Ёсць думка, што асоба пачынаецца са слоў «я сам», і чым часцей словы гэтыя гучаць, тым багацей робіцца чалавек, назапашвае ў сябе тыя каштоўнасці, якія ў будучым дазволяць ахарактарызаваць яго як адказнага, ініцыятыўнага, дзельнага працаўніка.**

Але, не спалохаюся гэтага сцвярджэння, студэнт вельмі часта не ведае, што такое **САМАКІРАВАННЕ**, чым ён, студэнт, можа **САМ КІРАВАЦЬ**. Вось і пагаворым пра гэтае загадкавае самакіраванне ў трох студэнцкіх вымярэннях.

## ХТО Ў ДОМЕ ГАСПАДАР?

**— Ты куды!**
**— Ды ў абшчагу.**
**(са студэнцкай размовы).**

СУПРАЦЬ студэнцкага жаргона я асабіста нічога не маю. Ён быў і будзе. Яму не адкажаш іншы раз у арыгінальнасці і лаканічнасці. Але вось што цікава: ужываецца ён нейк выбіральна. Любімаму выкладчыку мянушак не даюць, добрую сталоўку «марылкай» таксама не клічуць. І толькі спрадвечная студэнцкая «абшчага» так і застаецца ў сумнай большасці выпадкаў «абшчагай». Рэдка хто скажа па-іншаму.

— Чуў, што інтэрнат — гэта выпрабаванне на сумяшчальнасць, — дзяліўся ўражаннямі першакурснік,—але наша—яшчэ і праверка цярплівасці. Страшна запрасіць каго-небудзь у госці, прапускная сістэма «на вышыні». Як у іншых? Прыходзіць чалавек, пакідае дакумент, называе нумар пакоя, праходзіць. А ў нас усё куды больш складана: топчацца госць у фае, ловіць за рукі незнаёмых: «Калі ласка, паклікайце Пецю з трэцяга паверха!» З трэцяга, можа, яшчэ і паклічуць, а вось з дзесятага... Захочацца пасля гэтага сказаць «Ідзі дадому?» Наўрад ці. Не адчувае чалавек сябе гаспадаром. Стаяць за яго спіной «грозныя сілы»: вахцёр, камендант, касцелянша — усе тыя, каго называюць на мове афіцыйнай адміністрацыяй.

— І марыць пра гэтае не варта. Колькі ўжо год адно і тое ж паўтараецца. Што мы зможам сваімі сіламі? — пыталіся ў мяне ў адным з інтэрнатаў, дзе камендант і вахцёр ніяк не жадаюць «зразумець» студэнтаў.

**А ВЫ МОЖАЦЕ:**

Пачаць барацьбу з шэрасцю ў прамым сэнсе, перафарбаваўшы сцены, холы і дзверы інтэрната ў светлыя таны.

Спыніць штогадовае «качэўе» з пакоя ў пакой і перайсці да аседлага вобразу жыцця — чалавецтва ўжо даўно ацаніла яго перавагі. (Дарэчы, у некаторых інтэрнатах БДУ такая форма існавання ўжо практыкуецца і прыйшлася да спадобы студэнтам).

Арганізаваць студэнцкія працоўныя брыгады, якія ў час вучобы дапамогуць ліквідаваць непаладкі і адрамантаваць пакой па свайму густу. Вопыт гісторыка-педагагічнага факультэта Курскага пединстытута, дзе ўсё гэта ўжываецца, сведчыць: адносіны да інтэрната сталі другімі, гаспадарскімі. Тут забыліся, што існуе горкае слова «абшчага». Тут кажуць — **ДОМ.**

## ПАЙСЦІ Ў НАВУКУ — ЦЯРПЕЦЬ І МУКУ.

**— І што яны гавораць «семестр», «семестр», што такое гэты семестр!**
**(неўразуменне першакурсніка).**

**Для даведкі:**

Дж. Уотсан — у 25 гадоў адзін з аўтараў расшыфроўкі генетычнага кода, лаўрэат Нобелеўскай прэміі.

А. Эйнштэйн — у 26 гадоў аўтар спецыяльнай тэорыі адноснасці.

М. Басаў — у 30 гадоў аўтар фундаментальных прац па квантавай электроніцы, адзначаных Ленінскай і Нобелеўскай прэміямі.

...А ты пакуль што не ведаеш нават, што такое «семестр». І я не збіраюся сцвярджаць: маўляў, супакойся, усё наперадзе. Наперадзе толькі тое, што ты захочаш узяць ад вучобы ва універсітэце.



**СТАРШАКУРСНІКІ РАЯЦЬ**

**— Не саромцеся перапытаць. «Белыя плямы» ў канспекце — немінучы правал на экзамене.**

**— Не гавары, чаму вучыўся, гавары, што спазнаў, — народная мудрасць, выказаная задоўга да універсітэцкай эры, сёння як нельга больш дарэчы.**

Час ад часу ўспыхвае размова пра тое, што студэнту — учарашняму школьніку ці рабочаму — цяжка арыентавацца першы студэнцкі год у патоку інфармацыі, цяжка прывыкнуць да новых патрабаванняў. Бо і ўменне весці канспект — таксама навука.

Пра тое, як неабходна самастойная праца для першакурсніка, **КАМЕНТАРЫЙ КАМПЕТЭНТНАГА ЧАЛАВЕКА — І. Я. ПІСАРЭНКІ**, дацэнта кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў:

**— Узровень ведаў, атрыманых у школе, — надзейная база для заняткаў ва універсітэце. Другое пытанне, ці заўсёды адзнака, якая стаіць у атэстаце, рэальна адлюстроўвае гэтыя веды. Вучоба ў вышэйшай навучальнай установе — не штурм, а паступовае, але няўхільнае ўзыходжанне. У выйгрышы будуць тыя, хто ўмее планамерна працаваць. Гэта першая якасць, неабходная студэнту. Лічыцца, што першакурсніку асабліва цяжка прыстасавацца да неабходнасці штодзённага занатоўвання лекцый, канспектавання першакрыніц. Вынікі нашых сацыялагічных апытанняў паказалі, што самыя вялікія цяжкасці выклікае падрыхтоўка да семінарскіх, лабараторных заняткаў, гэта значыць, усё тое, што патрабуе самастойнай, мэтанакіраванай працы. Студэнт павінен адразу ж актыўна ўключыцца ў вучэбны працэс.**

**«НАБЫВАЙ У ЮНАЦТВЕ ТОЕ, ШТО З ГАДАМІ КАМПЕНСУЕ ТАБЕ СТРАТУ, ПРЫЧЫНЕНУЮ СТАРАСЦЮ. І, ЗРАЗУМЕЎШЫ, ШТО ЗДАБЫТКАМ СТАРАСЦІ З'ЯЎЛЯЕЦЦА МУДРАСЦЬ, ДЗЕЙНІЧАЙ У ЮНАЦТВЕ ТАК, КАБ СТАРАСЦЬ НЕ ЗАСТАЛАСЯ БЕЗ ПАЖЫТКУ».**

Добра, каб гэтая парада Леанарда да Вінчы стала вашым жыццёвым крэда.

## ЧАМУ БЫВАЕ «НІЧОГА»

**— Як справы!**
**— А, нічога...**
**(тыповы студэнцкі дыялог).**

ПЕРШ ЗА ЎСЁ дамовімся, што размова пойдзе пра час, вольны ад вучобы. Традыцыйна студэнцкае жыццё лічыцца вясёлым і шчодрым на пацехі. Першакурснік, напхнуты такімі ведамі, даверлівы. Прыходзіць і, склаўшы ручкі, чакае: дзе яны, тыя пацехі? Ідзе на першыя «складчыны» — там жа абавязкова павінна быць цікава, столькі равеснікаў побач. А ПОБАЧ — ЯШЧЭ НЕ ЗНАЧЫЦЬ РАЗАМ. Не растлумачылі яму, што і адпачываць трэба ўмець. Ёсць такое паняцце: узровень зносін. Вось гэтага ўзроўню часта і не хапае, адсюль і скаргі на нуду, і нязменнае «нічога» ў адказ на пытанне аб мінулым курсавым вечары. І так раз, другі, трэці... Чаканне чагосьці незвычайнага губіцца. І ўжо проста не хочацца паламаць галаву над чым-небудзь цікавым, прывычна задавальняюцца малым. А потым прымаюць позу расчараваных: і група інертная, і адпачыць няма дзе, і сходамі рознымі замучылі...

**СТАРШАКУРСНІКІ РАЯЦЬ**

**— Не чакайце, што весялосць сойдзе на вас з нябес. Простая, прыемная атмасфера — вынік сумесных намаганняў.**

**— Не адрознівайце толькі на «душу грамадства», уцягвайце ў размову і самых ціхіх, іх меркаванні часта бываюць найбольш арыгінальнымі.**

**— Танцы хутка надакучваюць. Зрабіце свой адпачынак больш разнастайным. Згадзіцеся, што акрамя магнітафона, які даводзіць суседзяў да шаленства, ёсць яшчэ і лес, вогнішча і песні пад гітару, тэатральныя і канцэртныя залы, а тое і проста прагулка па вячэрняму гораду...**

**Аднастайны толькі сум. «Гаўдэамус» — будзем весяліцца». Так называецца студэнцкае кафэ БДУ. Яго «фізіяномію» вызначае ўжо сама назва, у якой няма нічога ад бязлікіх «рамонкаў» і «брыганцін». І працуе яно па-асобаму: клубы па інтарэсах збіраюць людзей захопленых. Але... Энтузіясты, якія працавалі ў кафэ раней, скончылі універсітэт, раз'ехаліся хто куды. І «Гаўдэамус» не тое што стаў зусім дрэнным, але неяк зачахнуў, пацішэў. Вось яна, справа, якая патрабуе тваёй энергіі, першакурснік! Што зрабіць! Пафантазіруй!**

**ЯК ГЭТА РОБІЦЦА Ў ЛЕЙПЦЫГУ, расказаў у часопісе «Журналіст» Аляксандр Часнаў, выкладчык ЛДУ:**

«Вечары звычайна праходзяць так: гутарка ідзе ў вольнай форме пытанняў і адказаў. Вострыя праблемы, якія закранулі выступаючыя, вельмі жыва абмяркоўваюцца. Пасля размовы і дыскусіі — танцы. Прыкладна праз чатыры гадзіны пасля пачатку вечара гучаць апошнія акорды, яго ўдзельнікі разыходзяцца, а дзяжурныя прыбіраюць клуб»...

А ў Варашылаўградскім машынабудаўнічым інстытуце лічаць: трэба вучыць адпачываць, тут звяртаюць асаблівую ўвагу на эстэтычнае выхаванне студэнтаў, таму што няма нічога горш за чалавека, які набыў пэўную суму ведаў, але не «абцяжарыў» сябе высокай ступенню культуры. А лічбы, атрыманыя па выніках апытання студэнтаў 18 ВНУ краіны, насцярожваюць: ад 20 да 30 працэнтаў ніколі не былі ў драматычных тэатрах, да 50—60 — у оперных!

**...Студэнты заканчваюць навучанне, праблемы застаюцца, і разам са студэнцкім білетам табе, першакурснік, не ўручаць гатовых рашэнняў. Ідэальным свет бывае толькі ў дзяцінстве. Кагосьці адкрыццё гэтае спалохае, і ён, як страус, схаваецца ў сваім цесным мірку; кагосьці прымусіць дзейнічаць, дабівацца і... перамагаць. Каб студэнцкае жыццё было сапраўды жыццём, а не больш-менш паспяховым пераходам з курса на курс, не бойцеся часцей задаваць сабе пытанне: «ХТО, КАЛІ НЕ Я!».**

**Н. КАЛІШЭВІЧ,**
наш. кар.

КАЛІ ЛАСКА! Словы гэтыя ты, першакурснік, чуеш не ўпершыню. Але сэнс іх зараз некалькі зменіўся. Раней цябе запрашалі: прыходзь, будзь госцем, паспрабуй свае сілы. А цяпер універсітэт бачыць у табе гаспадара. Тут ёсць дзе праявіць свае здольнасці, знайсці справу па душы. У хуткім часе ты ўжо цвёрда запомніш расклад работы бібліятэк, даведаешся, колькі часу спатрэбіцца для таго, каб уляцець у аўдыторыю за хвіліну да пачатку лекцый, а дарогу да дэканата свайго факультэта знойдзеш нават з завязанымі вачыма...

Мы рады прыняць цябе ў студэнцкую сям'ю. Жадаем хутчэй пераадолець складаны перыяд акліматызацыі. Чакаем, што з тваёй маладой энергіяй, запалам і бадзёрасцю не перавядуцца ў сценах альма-матэр жарты, здаровая весялосць, жаданне дзейнічаць. Спадзяёмся, што праз пяць незабыўных студэнцкіх гадоў мы зноў пабачым цябе, на гэты раз ужо як кваліфікаванага спецыяліста. А пакуль што — прысвячаем гэтыя старонкі ўсім пачынаючым.

## Увага, першакурснік!

ТВАЯ ЗАХОПЛЕНАСЦЬ спатрэбіцца на факультэце грамадскіх прафесій. Зараз там працуюць наступныя аддзяленні: арганізатараў ваенна-патрыятычнай работы, мастацкага слова, фотакарэспандэнтаў, харэаграфіі, бальных танцаў, кіраўнікоў агітбрыгад, журналістыкі, эстэтыкі быту, піянерскіх важатых, грамадскіх інструктараў па спорту, мастакоў-афарміцеляў, стэнаграфіі, школы маладога лектара і арганізатараў грамадска-палітычнай работы. Выбірай на свой густ!



## Увага, першакурснік!

ТЫ ХВАЛЮЕШСЯ, што не атрымаў яшчэ ўсіх падручнікаў? Супакойся. Бібліятэка ўжо паклапацілася пра цябе — наладзіла групавое абслугоўванне. Памятай, што на працягу ўсяго навучальнага года ты зможаш не толькі браць у ёй патрэбныя кнігі, але і наведваць тэматычныя выстаўкі, атрымліваць кваліфікаваныя парады супрацоўнікаў бібліятэкі.

ПЯЦЬ МІНУТ НА ІНТЭРВ'Ю

# Самі пра сябе

**Адшукаць іх у гаманлівым студэнцкім натоўпе было лёгка — першакурснікаў вылучала нясмеласць. Адчувалася, што яны яшчэ ні ў чым толкам не арыентуюцца, дрэнна разбіраюцца ў планіроўцы карпусоў універсітэцкага гарадка, блытаюць назвы прадметаў, па якіх чытаюць лекцыі яшчэ не вядомыя ім выкладчыкі. Цікава, як успрымаюць яны першыя дні свайго навучання, з якімі думкамі прыступаюць да пяцігадовага студэнцкага марафона? Здаецца, лепш, чым яны самі, пра гэта не раскажа ніхто. Навадныя пытанні нашага карэспандэнта дапамогуць у гэтым.**

**— Ці адчулі вы ўжо сябе сапраўднымі студэнтамі?**

— Зразумела, не. Што ж гэта за студэнт, які сесію яшчэ ні разу не здаваў?! Вось, калі на ўласнай, як кажуць, скуры адчуеш, што гэта такое, тады і студэнтам маеш права лічыцца.

**— Ці змянілася што-небудзь у вашых поглядах на студэнцкае жыццё пасля першай «бульбы»?**

— Спачатку ледзь не плакалі, што не разам працаваць будзем. Групу ў розныя куткі параскідалі. А потым нават узрадаваліся, бо са студэнтамі старэйшых курсаў пазнаёміліся, шмат аб чым даведаліся, як кажуць, «з першакрыніц». Ды і адзін да аднаго ставіцца сталі па-іншаму. Ужо не толькі за знешні выгляд чалавек падабаўся. Ацэньвалі ступень добразычлівасці ў адносінах да сяброў, жаданне не адстаць ад іншых у працы.

**— Якой вы бачыце ідэальную студэнцкую групу?**

— Перш за ўсё, дружнай.

**— І як, далёка яшчэ да ідэала?**

— Пакуль што ой-ёй-ёй, як далёка. Мы ж яшчэ нават усіх прозвішчаў не ведаем. Працы наперадзе хопіць.

**— А якая якасць, на ваш погляд, перш за ўсё неабходна студэнту?**

— Камунікабельнасць!

— Гумар!

— Знаходлівасць, асабліва на экзаменах!

**— Ну, і што б вы самі сабе напаследак пажадалі?**

— Стварыць добры мікраклімат у групе, знайсці агульную мову і ў згодзе дайсці да апошняга курса!

**Мяркую, што да такіх пажаданняў не грэх далучыцца кожнаму.**

**У размове прымалі ўдзел першакурснікі I групы геаграфічнага факультэта А. Лабоцкая, С. Коршак, Ж. Баскакава, А. Жамойздзік, Ю. Конева, Ж. Шымко, Д. Барбікаў.**

**В. СКРЭМІНСКАЯ, студэнтка журфака.**

# ГІСТОРЫЯ З ГЕАГРАФІЯЙ, АБО ПАХВАЛЬНАЕ СЛОВА ПАСПЕШЛІВАСЦІ



ДА ЧАГО ўсё ж моцная ўлада стэрэатыпа. Чула: пінскі школьнік у 15 гадоў паступіў у БДУ на гістфак. І адразу вобраз яго сабе намалявала: самаўпэўнены, іранічны погляд, абавязковыя акуляры, пабластлівая манера размаўляць, у жэстах — раскаванасць, якая нават граніччыць з дзёрзкасцю. Словам, гэткі сучасны ўсёведны акселерат, якому пальца ў рот не кладзі.

Ах, і трапчаў жа, па ўсіх швах распаўзаўся выпешчаны мною вобраз, калі я пазнаёмілася з Сашам Кавалёвым! Хлопчык як хлопчык. І акуляраў не носіць, і зусім не самаўлюбёны, а нават нясмелы, і — вось ужо зусім не да твару вундэркінду,— футбол любіць, як усе звычайныя хлопчыкі.

Ён да гэтага часу памятае сваё першае — і адзінае ў жыцці — спазненне на ўрок. Клас «праходзіў» лічбу 7. Сімпатыя да «сямёркі» засталася крышачку смешным напамінкам аб дзяцінстве. Памятае і геаграфічную карту, што з маленства вісела над ложкам. Як расказвае сямейная легенда, ужо ў паўтара года, ледзь навучыўшыся гаварыць, Саша мог паказаць на ёй 40 краін. А ў астатнім — усё было так, як і ва ўсіх, толькі крыху раней. Чытаў — у тры, лічыў і пісаў — у чатыры, а ў школу пайшоў у пяць гадоў. Тлумачыць гэта проста: у дзіцячым садзе сумна стала. У пачатковых класах стаў запоем чытаць, і хутка высветлілася, што запас непрачытаных дзіцячых кніг катастрафічна растае. Дзіця ў наспех расшнураваным чаравіку, забыўшыся пра ўсё на свеце, уваткнулася ў кнігу. Гэта карціна маму ўжо не шакіравала.

Чаму так атрымалася, што сярод многіх — самымі любімымі сталі гістарычныя раказы, а апісанні далёкіх краін нязменна выклікалі захапленне? Растлумачыць цяжка. Магчыма, аказаў уплыў бацька, ён інжынер-разведвальнік, вучыўся ў Маскоўскім інстытуце інжынераў геадэзіі, аэраздымкі і картаграфіі. Можа, проста шчаслівая выпадковасць. Але першыя школьныя ўрокі не былі адкрыццямі, хутчэй дапамаглі сістэматызаваць прачытанае раней. І ўсё ж на іх было цікава. З правай кішэні вымаўся «чароўны сказ»: «Змяніліся прылады працы», і... сказ сапраўды аказваўся чароўным — мяняліся адносіны да прадмета. Ён ужо не быў адным з цэлага спіска абавязковай школьнай прамудрасці, а станавіўся адзіным. Самым-самым.

Мне стала цікава, ці не прывялі Сашыны веды гісторыі, якія выходзілі за рамкі школьнай праграмы, да таго, што ў старэйшых класах, калі элемент гульні на ўроках ужо, што называецца, не «працаваў», у яго з'явілася пачуццё перавагі? Вось, маўляў, ведаю, магчыма, і больш за настаўніка.

— Адзін такі момант, відаць, быў, — крыху збянтэжыўшыся, прызнаецца ён.— Гэта калі пра касманаўтыку гаварылі. Адчуў: я мацней. Але гэта і не дзіўна. Касманаўтыка — мой козыр. З першага класа цікаўлюся, вялікую калекцыю газетных выразак і кніг сабраў.

Гаварылі мы і пра тую каштоўную, з гадамі знікаючую, здольнасць успрымаць гісторыю як рэальнасць. Дзіця прастадушна верыць, што злая вядзьмарка, калі яно будзе сябе дрэнна весці, не замарудзіць з'явіцца, каб пакараць яго. Сашу здавалася, што трэба толькі захацець, і ён убачыць гарачыя дні паўстання Спартака. Больш таго — сам удзел прыме. Гэта было гэтак жа натуральна, як дыхаць, гаварыць, думаць... Пасталеўшы, ён зноў з асобай вастрынёй адчуў гэту еднасць, калі трапіў на поле Барадзінскага бою: «Туды можна прыязджаць тысячы разоў і ўсё роўна — мароз па скуры».

Здавалася б, пры такой захопленасці на нешта іншае ўжо не хопіць. Залаты медаль, атрыманы пасля заканчэння школы, красамоўна сведчыць — хапіла на ўсё.

— Цябе, напэўна, часта хвалілі? — пытаюся.

— Хва-лі-лі? Ніколі! Пастойце, хлушу. Было, у шостым класе другое месца на гарадской алімпіядзе па матэматыцы заняў... (У дужках заўважу, што матэматыка з фізікай — самыя нелюбімыя Сашыны прадметы. Аднак, пры паступленні ва універсітэт, «пяць» яму давялося атрымаць іменна па нелюбімай матэматыцы, якая прафіліруе на аддзяленні палітэканоміі).

— А шкадавалі часта?

— Часта. Аднакласнікі, калі мама чарговую «чацвёрку» замест «пяцёркі» па сачыненню ставіла.

Мама — настаўнік рускай мовы і літаратуры. Патрабаванні да сына — самыя строгія. Калі ўжо задала сачыненне — забудзь пра футбол. Чарнавікам лік губляецца. Ад яе ж — любоў да паэзіі і дысцыпліны. Побач, непрывычна пераплятаючыся, стаяць філасофская лірыка Лермантава і пушкінскі аптымізм. А што датычыць дысцыпліны, то тут ужо нехаця прыкладным станеш. На іншых каб паскардзіцца, бацькоў у школу выклікаць трэба, а аб тым, што Саша на ўроках размаўляў, тут жа ў настаўніцкай вядома стане. Сорамна было маму падводзіць.

Спрабую высветліць, колькі часу на ўроку ішло.

— Паўтары гадзіны, — адказвае.

— Што ж гэтак мала?

— З-за ляноты...

— ?!

— Ну, што вы так здзіўляецеся. Ленаваўся вусныя дома чытаць, дык я на ўроках слухаў. Усё і запаміналася.

Лічыцца, што калі чалавек захапляецца ў школе якім-небудзь сур'ёзным прадметам — шырокая яму дарога ў ВНУ. Якія ўжо тут праблемы выбару, усё і так зразумела. Саша, як казачны віцязь, стаяў на раздарожжы. Па-першае, што пераацягне: гісторыя ці геаграфія? (Геаграфія таксама вабіла з малых гадоў, неяк была так захапіла, што разбудзі сярод ночы — колькасць насельніцтва любой краіны назаве). Па-другое, было жаданне гады два на заводзе папрацаваць, да працоўнага жыцця далучыцца, і прафесія ёсць — токар, у ВВК другі разрад атрымаў, ды няшчасце здарылася: перад самымі выпускнымі экзаменамі зламаў руку. Рэзалюцыя ўрачоў: ніякай фізічнай нагрузкі — наклала «вета» на мары па завод. А «спрэчка» паміж гісторыяй і геаграфіяй закончылася ўнічыю: на аддзяленні палітэканоміі спатрэбіцца і тое, і другое.

— А ці жадаў бы ты, — зноў пытаюся,— каб твае будучыя дзеці таксама захапляліся гісторыяй з геаграфіяй?

— Ну, — смяецца, — пра дзяцей думаць пакуль ранавата... Аднак ведаю напэўна: палітычную карту свету над дзіцячым ложкам павешу абавязкова.

Пакуль што Сашу крыху нязвыкла ў новых абставінах. Адна справа, быць самым малодшым у школе, дзе цябе ўсе ведаюць і не вельмі заўважаюць розніцу ва ўзросце. І зусім іншая — хадзіць у «вундэркіндах» сярод студэнтаў. Як знойдзе ён з імі агульную мову? Як прывыкне да поўнай самастойнасці? Як, нарэшце, здасць сваю першую сесію, усё ж хоць якой, а славутасцю ён ужо стаў, і «гонар мундзіра» давядзецца абараняць адзнакамі выдатнымі. Многа яшчэ розных «што», «як», «чаму» набярэцца. Адно вядома дакладна: пашпарт Аляксандр Кавалёў атрымае ўжо будучы студэнтам.

**Н. НАДЗЕЖДЗІНА, наш кар.**

## Увага, першакурснік!

КАЛІ ТЫ АДЧУЕШ, што трэба ўжо і адпачыць, а гэта звычайна здараецца напярэдадні канікулаў,— карыстайся паслугамі прафкома. Там ты можаш атрымаць пуцёўку ў санаторый-прафілакторый, дамы адпачынку, турбазы. А калі ты аматар падарожжаў,— адпраўляйся ў турысцкую паездку па адным з саюзных маршрутаў.

ПАДРЫХТОЎКА высокакваліфікаваных спецыялістаў для замежных краін —адзін з важнейшых бакоў міралюбівага знешнепалітычнага курсу КПСС і Савецкага ўрада.

Выконваючы рашэнні XXVI з'езда КПСС і XXIX з'езда КПБ, Беларускі дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна ўносіць дастойны ўклад у справу падрыхтоўкі і выхавання замежных навучэнцаў. За перыяд знаёмым з новымі адкрыццямі ў той галіне навукі, тэхнікі, вытворчасці, якой займаешся. БДУ імя У. І. Леніна прадастаўляе магчымасць выпускнікам механіка-матэматычнага факультэта і факультэта прыкладной матэматыкі з замежных краін праслухаць цыкл лекцый «Спецыяльныя раздзелы сучаснай матэматыкі», арганізаваўшы для іх курсы павышэння кваліфікацыі.

## МЫ — ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІСТЫ

# «Удзячны за дапамогу»

з 1960 па 1982 год універсітэт закончылі 926 юнакоў і дзяўчат з 88 краін свету, 72 чалавекі абаранілі кандыдацкія дысертацыі, 120 замежных спецыялістаў прайшлі навуковую стажыроўку.

Юліана Хрыстава Пешава з НРБ у 1974 годзе закончыла факультэт прыкладной матэматыкі, у 1979 годзе абараніла кандыдацкую дысертацыю на кафедры метадаў аптымальнага кіравання і зараз працуе ў Інстытуце для замежных грамадзян імя Г. А. Насэра ў Сафіі. Разам з ёй працуе і выпускніца 1976 года Лазарына Дзімітрава. Антон Гурчаў закончыў універсітэт у 1977 годзе і зараз выкладае матэматыку ў Сафійскім хіміка-тэхналагічным інстытуце. Выпускнік механіка-матэматычнага факультэта 1979 года Ханс-Герт Грэбэ з ГДР працуе асістэнтам ва універсітэце ў горадзе Гале.

Кубінец Луіс Помба Каведа ў 1977 годзе закончыў ФПМ і зараз працуе старшым планавіком ў аддзеле транспарту і сувязі Дзяржплана Рэспублікі Куба, а яго аднакурснік Кабаньяс Ганзалес узначальвае кафедру эканамічнай кібернетыкі Вышэйшага Інстытута кіравання народнай гаспадаркай у Гаване.

Папал Наджыба з Афганістана вось ужо тры гады чытае методыку выкладання матэматыкі ў Кабульскай педагагічнай акадэміі.

У наш час нельга быць добрым спецыялістам, не будучы

На працягу месяца ў аўдыторыі імя акадэміка АН БССР Ф. Д. Гахава на механіка-матэматычным факультэце для спецыялістаў-матэматыкаў, што прыехалі з ГДР, Балгарыі, Афганістана, Кубы чыталі лекцыі вядучыя беларускія вучоныя, акадэмікі АН БССР У. П. Платонаў і У. І. Крылоў, член-карэспандэнт АН БССР Н. А. Ізобаў, дактары навук, прафесары Р. Ф. Габасаў, Г. А. Мядзведзеў, А. С. Фядэнка, Э. І. Звяровіч, П. П. Забрэйка, У. А. Кулажанка і іншыя.

— Мы імкнёмся зрабіць усё, што ад нас залежыць, каб слухачы курсаў адчулі пульс сучаснай матэматычнай навукі. Яны азнаёміліся з сучаснымі праблемамі матэматычнага аналізу, алгебры, алгебраічнай геаметрыі, дыферэнцыяльных ураўненняў, матэматычнай кібернетыкі, вылічальнай матэматыкі, эканомікі, удзельнічалі ў навуковых семінарах кафедраў, азнаёміліся з работай вылічальнага цэнтра, — гаварыў вучоны сакратар аргкамітэта курсаў дацэнт мехмата І. А. Паўлаў. — Вельмі добра, што на нашы запрашэнні прыехалі замежныя грамадзяне, выпускнікі іншых ВНУ СССР. Так, выкладчыкі Кабульскай педагагічнай акадэміі Махамад Арыф Юсуфі і Гулам Санай закончылі Харкаўскі дзяржаўны універсітэт, а выкладчык кафедры вышэйшай матэматыкі Кабульскага політэхнічнага інстытута Саід Юсуф Рахмані — выпускнік МДУ імя М. В. Ламаносава.

Усе слухачы аднадушна выказалі задавальненне высокім навуковым узроўнем праграмы курсаў.

— Я ўпершыню прыехаў у Савецкі Саюз, — адказаў выпускнік, а зараз выкладчык кафедры вышэйшай матэматыкі Кабульскага політэхнічнага інстытута Журандай Аманула. — Я вельмі задаволены, што мне пашчасціла пачуць думку вядучых вучоных па праблемах развіцця матэматычных навук на сучасным этапе. Усё, аб чым мы за гэты месяц даведаліся, для нас было цікавым і вельмі карысным. Я вельмі шчаслівы, што буду мець магчымасць вучыцца ў аспірантуры Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Мне спадабаўся ваш горад, яго жыхары, якія вызначаюцца дабратою і гасціннасцю.

Цёплаю і ўзаемнапрыемнаю стала сустрэча «за круглым сталом» былых навучэнцаў са сваімі выкладчыкамі, цяпер калегамі, арганізаваная дэканатамі двух факультэтаў. Выпускнікі універсітэта расказалі пра сваю работу, поспехі, планы на будучае, успаміналі незабыўныя студэнцкія гады, выкладчыкі падзяліліся сваім багатым вопытам работы.

Уручаючы пасведчанні аб заканчэнні курсаў, рэктар БДУ імя У. І. Леніна акадэмік АН БССР У. А. Белы пажадаў слухачам, каб атрыманы імі ва універсітэце навуковы патэнцыял, памножаны на малады запал, дазволіў ім дасягнуць новых вышынь у сваёй прафесіянальнай дзейнасці. З добрымі парадамі на дарогу звярнуўся да слухачоў намеснік міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР С. А. Малевіч. Ад імя слухачоў курсаў выступіў выкладчык Кабульскага політэхнічнага інстытута Саід Юсуф Рахмані:

— Мы атрымалі запрашэнне прыехаць на стажыроўку ў БДУ імя У. І. Леніна ў цяжкі дня нашай краіны час, калі многія лепшыя прадстаўнікі інтэлігенцыі загінулі ў барацьбе з унутранай контррэвалюцыяй, і краіна адчувае вялікую патрэбу ў кваліфікаваных спецыялістах. Мы не толькі набылі новыя веды, але і ўбачылі, як патрэбна змагацца за свабоду і працаваць на карысць свайго народа. Мы вельмі ўдзячны за дапамогу нашай краіне.

**У. БУДАЙ.**



**НА ЗДЫМКУ:** у час уручэння пасведчанняў аб праходжанні стажыроўкі.

Фота **аўтара.**

**ФІЗКУЛЬТ-УРА!**

# СКОРАСЦЬ ПАДОРЫЦЬ БАДЗЁРАСЦЬ

«УЗРОСТ СПОРТУ не перашкода». У праўдзівасці гэтых слоў яшчэ раз пераканаліся супрацоўнікі БДУ імя У. І. Леніна, што нядаўна сабраліся на універсітэцкім стадыёне. Сабраліся, каб вызначыць пераможцаў па бегу ў чатырох узроставых групах.

Першымі стартавалі жанчыны. На дыстанцыі 300 метраў у старэйшай узроставай групе пераможцай стала прадстаўнік каманды вылічальнага цэнтра Л. Рута, а ў забегу на 500 метраў першай фінішыравала В. Бурнос, зноў жа з каманды вылічальнага цэнтра.

У групе мужчын старэйшага ўзросту першынстваваў дацэнт факультэта прыкладной матэматыкі У. Бабкоў.

На старце самая шматлікая група — бегуны на 1000 метраў. Два кругі лідзіраваў прадстаўнік каманды ВЦ У. Ермалінскі. Але на апошніх метрах дыстанцыі яго абагнаў прадстаўнік каманды механіка-матэматычнага факультэта А. Жук.



Галоўны прыз за агульнакамандную перамогу заваявалі бегуны вылічальнага цэнтра (адказная за спартыўна-масавую работу В. Дзмітрыева). Прыз за масавасць і актыўнасць уручан камандзе факультэта прыкладной матэматыкі (адказны за спартыўна-масавую работу Л. Вараб'ёў). Пераможцы на асобных дыстанцыях узнагароджаны граматамі мясцовага камітэта і памятнымі падарункамі. Спаборніцтвы прайшлі зладжана і арганізавана, у чым заслуга судзейскай калегіі, якую ўзначальвала выкладчыца кафедры фізічнай культуры В. Зарэцкая.

Усе ўдзельнікі, незалежна ад занятых месц, атрымалі добры зарад бадзёрасці і энергіі.

Але, на жаль, не ўсе факультэты прынялі ўдзел у спаборніцтвах. Не было на стадыёне каманд фізічнага, геаграфічнага, гістарычнага, філалагічнага факультэтаў. Узнікае пытанне: «Чаму?» Чытачы нашай газеты чакаюць адказу ад кіраўнікоў гэтых факультэтаў.

**М. КУЧЫНСКІ,**
**старшыня спартыўна-масавай камісіі прафсаюзнага камітэта супрацоўнікаў.**



# КАЛЯНДАР ПРЫРОДЫ

*КУДЫ ПАЛЯЦЕЎ цудоўны водар летніх траў, знікла глыбіня яснага неба? Кастрычнік... Восень па-свойму цудоўная — гэта бясспрэчна, але ёсць у ёй і нешта журботнае.*

*Дрэвы і травы пажоўклі, нібы вымазанае шэрай фарбай неба прыводзіць усё акружаючае да адзінокага маркоту. Пастаянна здаецца развітальны жураўліны крык — песня разлукі з роднымі краямі. Гэта спрадвечны закон, што паўтараецца з году ў год. Будучая зіма праганяе птушак з дарагіх, незабыўных месц. Але прыйдзе ж вясна! Абавязкова прыйдзе! І яны вернуцца зноў да заліўных лугоў свайго дзяцінства, да сваіх старых гнёздаў.*

**А. ВАЛОШЫН.**

Фотаэцюд **В. Шачака.**

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

21 кастрычніка 1982 г.
Зак. 1849. АТ 21525

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ